Мясцовае самакіраванне
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў
5 ліпеня 2017 г.
№24 (408)



стар. 5

**Падумалі і стварылі... асацыяцыю Саветаў**



стар. 6

**У полі зроку — праблемныя сем'і**



стар. 8

**Па цэнтральнай вуліцы з аркестрам**

ТЭМА ТЫДНЯ

# РОБАТЫ, СПАДАРОЖНІКІ І ПАЛЬЧАТКА-ТРЭНАЖОР

Якімі інавацыямі здзівілі беларусы наведвальнікаў выстаўкі падчас IV Форуму рэгіёнаў

Фота БЕЛТА.




Беларускія дзяўчаты з БРСМ у вышыванках.

**На ўваходзе на выстаўку Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі сустракае робат, што паважліва спыняецца насупраць і пачынае вітацца: «Я рада быць тут і бачыць вас...» Нездарма сёлетнюю выстаўку назвалі «інавацыйнай». Сапраўды, на ёй можна даведацца пра ўнікальныя тэхналагічныя дасягненні нашых краін.**

Першае — і самае вялікае, што прыцягвае ўвагу, гэта беларускі электробус. Падчас наведвання выстаўкі спікеры верхніх палат беларускага і расійскага парламента толькі што не праехалі на ім: ацанілі, наколькі зручна ўнутры, прайшліся па салоне, уважліва разгледзелі. Дарэчы, ужо ідуць перагаворы аб тым, каб пастаўляць такі від транспарту ў расійскую сталіцу.

стар. 3

НА ВЫЕЗД!

# Добрая звычка



На «Ціхмянаўскай вышыні».

**Наш карэспандэнт прыняў удзел у выязной сесіі Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў. У цэнтры ўвагі была тэма добраўпарадкавання.**

## ВЁСКА МАЕ... ГЕРБ

Аўтару гэтых радкоў прапанавалі экскурсію па тэрыторыі Бабінавіцкага сельсавета. Прыгожа і ўтульна ў аграгарадку Бабінавічы. Тутэйшыя жыхары ганарацца яго па-свойму ўнікальнай гісторыяй. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года Бабінавічы былі горадам з насельніцтвам каля 1160 чалавек і мелі свой герб. Такім чынам, вопыт самакіравання тут вялікі.

— Першапачаткова герб быў зацверджаны Кацярынай II — у 1781 годзе. На ім — дзве мачты з флюгерамі. Мачты — бо шмат вякоў продкі зараблялі на продажы лесу, з якога рабілі і караблі. Яго па Заходняй Дзвіне сплаўлялі аж у Рыгу. А ў 2014-м Прэзідэнт падпісаў Указ, дзякуючы якому ў населенага пункта зноў з'явіўся герб. На сёння ў Бабінавічах усяго каля 400 жыхароў, — расказвае **старшыня Бабінавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Вольга МАРЖАЕДАВА.**

Пра мінулае шмат расказалі ў народным музеі баявой славы, які пакуль што знаходзіцца ў яслях-садку-базавай школе. Летась навучальнай установе споўнілася 210 гадоў: у 1806-м у Бабінавічах адкрылі двухкласнае прыходскае вучылішча. 3-за таго што ў школе параўнальна мала дзятвы, яе зачыняюць. У новым вучэбным годзе дзяцей будуць вазіць на вучобу ў суседні аграгарадок... Але застанецца цудоўны сад, вінаграднік, у цэлым добраўпарадкаваная тэрыторыя.

## УНІКАЛЬНАЕ ГАНЧАРСТВА

Музейную экспазіцыю плануюць размясціць у будынку прадстаўнічага органа ўлады. Бадай, гэта будзе першы такі вопыт у вобласці.

— А музей наш багаты на экспанаты. У прыватнасці, расказваем пра знакамітую бабінавіцкую школу ганчароў. Да сярэдзіны 1950-х тут працавала арцель: каля 40 майстроў! Пра традыцыйнае рамяство нават у Вялікай савецкай энцыклапедыі напісалі. Наша ганчарства мае сваю непаўторную асаблівасць, — расказвае **дырэктар школы Таццяна ВАРАНЦОВА.**

стар. 5